Belarusisch-Deutsche Geschichtskommission
Беларуска-германская гістарычная камісія

# Конкурс
# Беларуска-германскай гістарычнай камісіі на атрыманне стыпендый для навукова-даследчых стажыровак

Беларуска-германская гістарычная камісія (далей названая “Камісія”) спрыяе сумеснаму даследаванню беларускай і нямецкай гісторыі, яе транснацыянальнага кантэксту і гістарычных узаемадачыненняў паміж Германіяй і Беларуссю. Пры гэтым камісія жадае таксама падтрымліваць трансгранічныя даследаванні **студэнтаў старэйшых курсаў і маладых навукоўцаў з абедзвюх краін.** Дзеля гэтага Камісія выдзяляе **стыпендыі для навукова-даследчых стажыровак у Германіі і Беларусі** працягам аднаго месяца. Стыпендыі служаць падтрымцы навуковай дзейнасці, якая адпавядае мэтам Беларуска-германскай гістарычнай камісіі.

**Тэрмін, на які выдзяляецца стыпендыя:** 1 месяц.

**Аб’ём стыпендыі:** Стыпендыя складае 2 500 еўра для аднамесячнай навукова-даследчай стажыроўкі ў Германіі і 2 000 еўра для аднамесячнай навукова-даследчай стажыроўкі ў Беларусі. Дадатковыя выплаты на пакрыццё выдаткаў у сувязі з праездам і пражываннем і надбаўкі для стыпендыятаў з сям’ёй не прадугледжаны.

Не пазней чым праз тры месяцы пасля заканчэння перыяду, на які выдзяляецца стыпендыя, неабходна падаць справаздачу аб выніках навукова-даследчай стажыроўцы аб’ёмам не менш за дзве старонкі.

**Дакументы, якія падаюцца ў якасці заявы:**

- кароткае апісанне даследчага праекта са звесткамі аб стане даследавання, папярэдне праведзенай працы, метадах і крыніцах (да 3 старонак),
- план работ у час плануемай аднамесячнай навукова-даследчай стажыроўкі,
- рэзюмэ, спіс публікацый па тэме,
- пісьмовая рэкамендацыя навуковага кіраўніка ці іншай асобы з акадэмічнай сферы

Кароткае апісанне даследчага праекта і план работ для заяў з Беларусі падаюцца на беларускай (ці рускай) і англійскай мовах, астатнія дакументы падаюцца на беларускай ці рускай мове. Для заяў з Германіі кароткае апісанне праекта і план работ падаюцца на нямецкай і англійскай мовах. Астатнія дакументы для ўдзелу ў конкурсе на нямецкай ці англійскай мове.

Просьба дасылаць заявы на ўдзел у форме файла ў фармаце PDF да **1 чэрвеня 2020 г.** электроннай поштай на адрас belanovich-petz@dgo-online.org або gross.alena@mail.ru

Кантактныя асобы:
Алеся Белановіч-Пэтц, Нямецкае таварыства па вывучэнні Усходняй Еўропы, Берлін
belanovich-petz@dgo-online.org
Алена Грос, Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Мінск
gross.alena@mail.ru